вядучага-канферансье. Вядучы можа быць апрануты і ў нацыянальны касцюм ці касцюм персанажа свята.

Першы варыянт - віктарына на тэму свята.

Другі варыянт - вырашэнне інтэлектуальных задач рознай складанасці з элементамі гульнявога спаборніцтва (спартыўнага, выканаўчага і інш.).

У гэтых выпадках падзейны рад будуецца па наступнаму прынцыпу: умовы гульні, выкладзеныя вядучым, - экспазіцыя; выбар прадмета гульні і яе распачынальнікаў - завязка; развіцце гульні - развіццё дзеі і , нарэшце, у фінале гульні - кульмінацыя. Вынікі і падлік балаў пераможцаў - развязка.

Умоўнае азначэнне гульняў гэтага тыпу - «Дыялог з гледачом».

Тып другі - сюжэтныя гульні. Вядучы (ці вядучая) уступаюць у дыялог з партнёрам альбо групай партнёраў, прапануючы адпаведны сюжэт. Магчымыя вобразы: Важак з Мядзведзем, Важак з Казой, Цыган з Канём, Несцерка з Паўлінкай, скамарохі і інш.

Кампазіцыйная пабудова праграмы:

1) развіцце падзей ў межах сюжэта ражаных (вядучых);

2) далучэнне ў ходзе падзей гледачоў;

3) пераключэнне вядучых (ражаных) на дыялог з гледачом, калі кожны, хто ўступае ў гульню, «уваходзіць у вобраз» пэўнага з адсутнічаючых персанажаў свята альбо кожны, хто ўступае ў гульню, застаецца самім сабою, прымаючы ўмовы гульні, як у «тэатры масак», імправізуючы далейшыя дзеі і падтрымліваючы дыялог з ражанымі.

Пры распрацоўцы тэкстаў аўтар прадумвае лінію дзеі праз дыялог з гледачом, плануе схему яго развіцця, рыхтуючы, такім чынам, глебу для імправізацыі.

Аверкава Н.К.,
выкладчык

## МЕТОДЫКА РАСПРАЦОЎКІ ВОБРАЗНЫХ БАЧАННЯЎ У СЛОЎНЫМ ДЗЕЯННІ

Адным з галоўных прадметаў у комплекснай падрыхтоўцы рэжысёра свят з'яўляецца «Моўнае дзеянне». Менавіта яму належыць значная роля ў выхаванні рознабаковых прафесійных якасцей спецыяліста і непасрэдна галоўнай з іх - авалоданне рэжысёрам законамі моўнага дзеяння ў розных літаратурных жанрах.

Слову належыць адно з вядучых месцаў у ажыццяўленні разнастайных функцый свята: дзейснай, эстэтычнай, мастацкай, гістарычнай, нацыянальна-патрыятычнай і інш. Такая значнасць слова ў свяце абавязвае рэжысёра грунтоўна авалодаць законамі моўнага дзеяння.

Паколькі агучанае слова ёсць учынак, накіраваны на змену сітуацыі (папраўку, удакладненне, дапаўненне поглядаў, уяўленняў слухачоў аб чым-небудзь), то выпрацоўка актыўнага дзеяння складае цэнтральную задачу выканаўцы па ўвасабленні літаратурнага матэрыялу ў жывое дзейснае слова.

Перадаць слухачам думку ў яркіх вобразах мастацтва - галоўная задача выканаўцы-мастака.

Пры дасягненні гэтай мэты, як паказвае практыка, адной з асноўных перашкод з'яўляецца недахоп, недакладнасць вобразных уяўленняў (бачанняў) у студэнта. Тлумачыцца гэта ў значнай ступені невялікім практычным вопытам студэнта думаць вобразамі, уяўленнямі, што з'яўляецца фундаментам творчай працы над тэкстам.

Адсутнасць перад вачыма непасрэднай прычыны, што нараджае слова (г.зн.аб'ектаў апавядання), выклікае ў яго пустое словамаўленне. У жыцці мы бачым тое, аб чым гаворым, малюем зрокавыя вобразы, а на сцэне гэты момант упускаем. А калі не бачым, губляем і сэнс, і значэнне паняццяў, і сілу ўздзеяння таго, аб чым гаворым. Адсюль вынікае задача перад выканаўцам - накіраваць сваю ўвагу на аднаўленне натуральнага моўнага парадку: бачу, уяўляю (вобраз), потым вымаўляю (слова).

Патрабуецца вялікая праца, каб напоўніць аўтарскія словы сваімі бачаннямі.

Вычарпальнае веданне апісваемай аўтарам рэчаіснасці - аснова для непарыўнай стужкі бачанняў. Такое веданне ў яркіх, канкрэтных, разнастайных бачаннях пераўтварае аўтарскі тэкст у свой асабісты расказ аб перажытым, які актыўна ўздзейнічае на слухача.

Працэс стварэння бачанняў насычае слова жывымі чалавечымі эмоцыямі, уключае ў працэс падсвядомасць, творчую прыроду выканаўцы. Вялікае месца тут мае творчая фантазія. Яна дае магчымасць дадумваць характары, падзеі, дапоўніць перажыванні, дапамагае ажывіць факты канкрэтнымі бачаннямі, падмацаваць думкі зрокавымі карцінамі, паглыбіць адносіны да перадаваемых падзей і з'яў.

Назапашванне бачанняў - неабходная і захапляючая праца. Яна прымушае студэнта быць назіральным, уважлівым да дэталей, развівае фантазію, эмацыянальную памяць.

Чым паўней, ярчэй і разнастайней бачанні, чым больш поўна суадносяцца яны з эмацыянальным вопытам студэнта, тым мацней адгукнецца пачуццё ў яго шматбаковых уражаннях: і зрокавых, і слыхавых, і рухальных.

У кожнага студэнта свой асабісты вопыт і свае непаўторныя, цікавыя шляхі бачання, асацыяцыі.

Практыкай моўнага дзеяння вылучаюцца найбольш значныя прыёмы назапашвання, стварэння вобразных бачанняў, якія рэкамендуецца выкарыстоўваць студэнтам у творчай працы над тэкстам.

1. Прыем асабістай значнасці ці суаднесенасць з сабою.

(Гэты прыем ляжыць у аснове творчага працэсу. Адшукаць у сваей эмацыянальнай памяці аналагічныя моманты. Усе суаднесці з сабой, зрабіць сваім асабістым, значным для сябе.)

2. Прыем фіксацыі бачанняў у прасторы і руху.

3. Прыем канкрэтызацыі.

(Прадмет успрымаецца ўсім комплексам адчуванняў, але штосьці дамініруе ў гэтых адчуваннях. Выбраць моцныя адчуванні, якія ўразілі выканаўцу.)

4. Прыем перабольшвання і пераменшвання. (Каб бачанні хвалявалі выканаўцу, яны павінны быць не радавымі, звычайнымі. Яны павінны быць вышэй звычайнага ўзроўню, звычайнай нормы: яны занадта прыгожыя альбо брыдкія; гарачыя ці халодныя. Гэта згустак найбольш яркага і характэрнага.)

У мэтах замацавання гэтых прыёмаў прапануецца студэнтам зрабіць невялікія слоўныя эцюды на знаёмыя тэмы: «Мая сям'я», «Мой любімы занятак», «Цікавая сустрэча», «Маё дзяцінства» і інш.

У выпрацоўцы вобразных бачанняў шырока выкарыстоўваць другія віды мастацтва (жывапіс, музыку, кіно і інш.).

Вітошкіна З.М.,
ст.выкладчык

## БАЛЬ НА ПЛОШЧЫ, СТАДЫЕНЕ

На сучасным этапе актуальным з'яўляецца адраджэнне шляхецкага этыкету пры стварэнні танцавальных кампазіцый у тэатралізаваных баляваннях, карнавалах на плошчах, стадыёнах, у парках. Таму вельмі адказным павінен быць рэжысёрскі падыход да стварэння гэтых прадстаўленняў, адбор сродкаў пластыка-харэаграфічнага вырашэння танцавальных кампазіцый, якіх патрабуе кожная гістарычная эпоха.

Заключнай часткай пераважнай большасці свят з'яўляецца баль ці карнавал на плошчы. Чым аб'ёмней выкарыстоўваюцца разнастайныя віды танцавальнай лексікі, тым вышэй мастацкі ўзровень балю. Вялікае значэнне ў стварэнні кампазіцый на аснове гістарычна-бытавога танца мае падбор музычнага матэрыялу. Музыка вызначае не толькі рытмічны бок танца, яна падказвае характар выканання. Пажадана, каб студэнты авалодалі метадам стварэння ўласных кампазіцый на аснове гістарычна-бытавых танцаў. Знаемства з разнастайнымі танцавальнымі стылямі, сапраўднымі музычнымі крыніцамі ўзбагачае творчую палітру будучых рэжысёраў, вучыць узнаўляць карціны мінулых эпох.

На балі і маскарады было прынята з'яўляцца ў незвыклах строях і масках. На баляваннях у феадалаў ствараліся праменадныя танцы - шэсці. Яны мелі ўрачысты характар і былі тэхнічна нескладанымі. Таму ў дадзеным фрагменце свята могуць удзельнічаць выканаўцы, не маючыя спецыяльнай харэаграфічнай падрыхтоўкі.

Госці, што былі ўдзельнікамі балю, у сваіх лепшых уборах праходзілі перад гаспадаром, быццам дэманструючы сябе і свой убор. Гэта і быў асноўны сэнс танца - шэсця. Шэсце можна зрабіць пры вызначэнні лепшага касцюма балю. Урачыстасць правядзення конкурсу спрыяе стварэнню святочнага настрою ўдзельнікаў і гледачоў прадстаўлення.

Вялікае значэнне мае перамяшчэнне ўдзельнікаў танцавальнай кампазіцыі на плошчы, лагічныя пераходы з аднаго малюнка ў другі. Для гэтага пажадана выкарыстоўваць геаметрычна правільныя фігуры: вертыкальныя і гарызантальныя лініі, кругі, ромбы, дыяганалі і г.д.

Пластыка-харэаграфічнаму вырашэнню прадстаўлення на плошчы належыць вядучае месца ў тэатралізаваным дзеянні. Граматная праца са сцэнарыем дапамагае вызначыць яркія бакі тэатралізаванага спектакля - прадстаўлення, здзейсніць цікавыя пастаноўкі танцавальных кампазіцый розных эпох, у тым ліку балю, і ажыццявіць іх на плошчы ў гонар вялікай падзеі, свята горада, рэспублікі і інш.

У час падрыхтоўкі свята неабходна вырашыць рад пытанняў. Галоўныя з іх наступныя.

1. У залежнасці ад прасторы і рэльефу, які выкарыстоўваецца для прадстаўлення, вядуцца падрыхтоўка графічнага плана перамяшчэння ўдзельнікаў кампазіцыі, падбор музычнага матэрыялу.

2. Падбор удзельнікаў выступлення, вывучэнне танцавальных кампазіцый; стварэнне ці падбор касцюмаў для балю.

3. Рэпетыцыі на месцы правядзення свята.

Асновай поспеху ў вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення свята, з'яўляюцца паэтапная папярэдняя праца рэжысёра, поўнае выкарыстанне яго арганізацыйных і творчых здольнасцей.

Матульскі Р.С.,
дацэнт

## ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЕЎРОПЫ І БЕЛАРУСІ

1. Месца і роля бібліятэк ў грамадстве. Змест і асноўныя напрамкі развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі неразрыўна звязаны з сацыяльным прызначэннем бібліятэк